УДК 378.126«1910»

**В. М. Астрога**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (БДТУ)

# ПЕДАГАГІЧНЫЯ КУРСЫ ПРЫ НАСТАЎНІЦКІХ ІНСТЫТУТАХ БЕЛАРУСІ Ў 1910-Я ГГ.

У публікацыі вызначаецца роля педагагічных курсаў у сістэме педагагічнай адукацыі Беларусі ў пачатку XX ст. Адна- і двухгадовыя курсы ствараліся пры гарадскіх вучылішчах, настаўніцкіх семінарыях, гімназіях. З адкрыццём настаўніцкіх інстытутаў у 1910-я гг. у Віцебску і Мінску яны былі арганізаваны і на базе гэтых навучальных устаноў. Разглядаюцца правілы прыёму на курсы, арганізацыя вучэбна-выхаваўчага працэсу, фінансавання, забеспячэння неабходнымі вучэбнымі дапаможнікамі і абсталяваннем.

The article deals with the role of specialized courses in the Belarusian system of pedagogical education in the early 1900s. One- and two-year courses were organized by the city colleges and gymnasiums. Pedagogical institutes being founded in the 1910s, such courses appeared on their basis in Minsk and Vitebsk. The rules of admission to the courses, as well as organization of the academic process, financial base, and the needed educational literature and equipment have been described in the article concerned.

**Уводзіны.** Пэўнае месца ў сістэме дарэвалюцыйнай педагагічнай адукацыі Беларусі займалі педагагічныя курсы.

На тэрыторыі Віленскай навучальнай установы яны пачалі ўзнікаць у пачатку XX ст., бо, як адзначаў дырэктар народных вучылішчаў Мінскай губерні, «існуючыя семінарыі не могуць задаволіць патрэбы ў настаўніках, а адкрываць іх у вялікай колькасці нельга: семінарыі вельмі дорага каштуюць. Давядзецца звярнуцца да больш таннага і больш хуткага сродку… і адкрываць педагагічныя курсы» [1]. Нават у 1914 г., калі ў Расіі працавалі 105 настаўніцкія семінарыі, па падліках камісіі III Дзяржаўнай Думы, падрыхтаваць за год яны маглі каля 3750 настаўнікаў, у той час як для запаўнення школьных сетак патрабавалася 20 тысяч. Каб задаволіць патрэбу ў педагагічных кадрах, неабходна было адкрыць да 600 семінарый, што тады было проста немагчыма. Таму шукалі больш простыя і танныя спосабы падрыхтоўкі патрэбных педагагічных кадраў для працы ў навучальных установах.

**Асноўная частка.** 31 сакавіка 1900 г. Міністэрства асветы зацвердзіла Правілы аб педагагічных курсах для падрыхтоўкі настаўнікаў і настаўніц з мэтай «падрыхтаваць маладых людзей, якія атрымалі ніжэйшую адукацыю, да іспытаў на званне настаўніка пачатковага вучылішча і азнаёміць тэарэтычна і практычна з пастаноўкай і вядзеннем пачатковага навучання» [2].

Аднагадовыя курсы з моманту іх арганізацыі набылі пэўнае распаўсюджанне, дзякуючы сваёй таннасці і кароткаму тэрміну падрыхтоўкі. У 1900 г. аднагадовыя педагагічныя курсы былі адкрыты пры Свянцянскім і Навагрудскім, у 1902 г. – пры Мсціслаўскім, Магілёўскім і Віцебскім гарадскіх вучылішчах [3]. На Беларусі ў 1905 г. іх было 5 з 50 навучэнцамі. З адкрыццём настаўніцкіх інстытутаў у 1910-я гг. (у Віцебску, Магілёве і Мінску) арганізоўваліся яны і на базе гэтых навучальных устаноў.

29 чэрвеня 1907 г. міністэрства выдала новыя правілы для арганізацыі педагагічных курсаў. Згодна з імі, тэрмін навучання павялічваўся да двух гадоў, бо нізкі ўзровень падрыхтоўкі настаўнікаў пачатковай школы праз аднагадовую сістэму выразна адлюстроўваўся на практыцы. Існуючыя педагагічныя курсы пераўтвараліся ў двухгадовыя, дадаткова арганізоўваліся ў Гродне, Коўна і іншых гарадах.

15 студзеня 1909 г. былі адкрыты і на наступны дзень пачалі працу жаночыя педагагічныя курсы ў г. Мінску [4]. Курсы былі створаны пры 2-ім жаночым чатырохкласным вучылішчы. У штаце працавалі наступныя асобы: загадчык вучэбнай часткай Ф. І. Цясто, наглядчыца курсаў В. Н. Шыдлоўская, яе памочніца Л. М. Сакалова, а таксама выкладчыкі Закона Божага а. Уладзімір Зубковіч, педагогікі Л. Я. Садоўскі, рускай мовы Ф. М. Міхайлаў, прыродазнаўства і фізікі Ф. А. Парыйскі, гісторыі С. К. Раманоўскі, геаграфіі Д. Т. Кузьмук, спеваў Н. Д. Краснапітуеў і рукадзелля М. К. Русанава.

Педагагічны савет рагледзеў заявы 75 дзяўчат, большасць з якіх на дадзены момант закончылі курс чатырохкласных вучылішчаў, двухкласных міністэрскіх і прыватных гімназій. Адбор вёўся на аснове ўступных экзаменаў. Быў устаноўлены наступны парадак для жадаючых паступіць на курсы: тыя, хто скончыў жаночыя вучылішчы тыпу мужчынскіх гарадскіх па палажэнні 1872 г., праходзілі скарочаныя іспыты – трэба было на здавальняючую адзнаку выканаць 4 пісьмовыя работы (дыктоўка і сачыненне па гісторыка-геаграфічнай тэматыцы, пісьмовае

рашэнне арыфметычных задач і вусны экзамен па Законе Божым). Тыя, хто на момант паступлення меў ніжэйшую адукацыю, здавалі экзамены па 8 прадметах у аб'ёме курса мужчынскага па палажэнні 1872 г. вучылішча.

Тэрмін навучання аб'яўляўся двухгадовым, таму ўжо ў жніўні 1909 г. з лепшых слухачак быў набраны 2-гі клас, каб «даць магчымасць хутчэй закончыць навучанне і заняць пасаду настаўніц». Для канчатковага выбару самых здольных курсістак былі назначаны экзамены: пісьмовыя па рускай мове (дыктоўка і сачыненне), па арыфметыцы пісьмовы і вусны (тлумачэнне рашэння задач) і вусны па прыродазнаўчых прадметах. Як паказалі іспыты, з абраных 38 слухачак узровень 25 быў прызнаны нізкім. Таму толькі 13 дзяўчат былі пераведзены на другі курс.

Падрыхтоўка педагогаў была арганізавана таксама згодна з «Палажэннем аб часовых педагагічных курсах пры настаўніцкіх інстытутах для падрыхтоўкі настаўнікаў вышэйшых пачатковых вучылішчаў» пры Мінскім настаўніцкім інстытуце [5]. Навучанне пачыналася з 1916 г. на бюджэтнай аснове, прычым перавага сярод астатніх давалася асобам, якія пацярпелі «ў апошняй вайне» (маецца на ўвазе ў Першай сусветнай вайне). Дарэчы, сам інстытут быў эвакуіраваны ў г. Яраслаўль.

Кіраўніцтва педагагічных курсаў прызнавала пажаданым, каб узровень навучання даваўся не ніжэйшы, чым пры заканчэнні настаўніцкага інстытута. Наогул для курсаў адзіных планаў і праграм не было. У кожнай навучальнай установе, пры якой адкрываліся такія курсы, яны распрацоўваліся і абмяркоўваліся на педагагічным савеце. У любым выпадку вучэбныя праграмы не вельмі розніліся і былі скарочаным варыянтам зместу адукацыі настаўніцкіх інстытутаў.

Заняткі на педагагічных курсах пры Мінскім і Віцебскім настаўніцкіх інстытутах умоўна можна падзяліць на тэарэтычныя і практычныя. Да тэарэтычных адносіліся:

1) Закон Божы як асновы веранавучання;

2) педагогіка;

3) падрабязнае азнаямленне з праграмамі курса вышэйшых пачатковых вучылішчаў па асобных прадметах і рэкамендацыямі асноўнай навуковай літаратуры;

4) методыка выкладання ўсіх прадметаў курса і разгляд выдадзеных дапаможнікаў для вышэйшых пачатковых вучылішчаў.

Практычныя заняткі ўключалі:

1) наведванне вышэйшых пачатковых вучылішчаў, дзяжурства ў іх і пісьмовыя справаздачы, якія разглядаліся настаўнікамі вышэйшых пачатковых вучылішчаў і дырэктарам інстытута;

2) пробныя ўрокі ў вышэйшых пачатковых вучылішчах і іх аналіз;

3) лабараторныя заняткі і экскурсіі.

Па спецыяльнасцях слухачы падзяляліся на 3 групы: літаратурна-гістарычную; фізіка-матэматычную; прыродазнаўча-гістарычную.

Па агульных прадметах прадугледжвалася 12 гадзін у тыдзень: Закон Божы – 1 гадзіна, педагогіка – 4, руская мова і методыка – 2, матэматыка і методыка – 2, маляванне і чарчэнне – 3. Прадугледжваліся і спецыяльныя заняткі: для першай групы – руская мова з царкоўнаславянскай – 8 гадзін, гісторыя – 4 гадзіны, усяго – 12 гадзін у тыдзень; для другой групы – матэматыка 8 гадзін, фізіка – 4 гадзіны, усяго – 12 гадзін у тыдзень; для 3 групы – прыродазнаўства – 8 гадзін, геаграфія – 4 гадзіны, усяго 12 гадзін у тыдзень. Дадаткова падчас практыкі для кожнай спецыялізацыі прадугледжвалася па 4–5 гадзін на пробныя ўрокі.

Не адзін раз адміністрацыя курсаў уздымала пытанне пра павелічэнне колькасці заняткаў, напрыклад, па гісторыі, геаграфіі, прыродазнаўстве, пра выкладанне дадаткова замежных моў. Але гэтую задуму, як тлумачылі ў кіраўніцтве Віленскай навучальнай акругі, рэальна было ажыццявіць толькі за кошт скарачэння гадзін на вывучэнне іншых дысцыплін ці за дадатковую плату. Па прапанове праўлення Віленскай навучальнай акругі планавалася давесці колькасць тыднёвых заняткаў у 1 класе да 30, у другім – да 36. Але, як паведамляла адміністрацыя курсаў, гэта павелічэнне «ставіць курсы матэрыяльна ў цяжкае становішча, бо перавышае расходы, зацверджаныя па штатах». Каб выправіць становішча, па згодзе выкладчыкаў, якія ўдзельнічалі ў разборы практычных урокаў, было вырашана пакінуць гэтыя заняткі без аплаты. Педагогіку і псіхалогію, як правіла, на грамадскіх пачатках чыталі дырэктары настаўніцкіх інстытутаў, што несумненна сведчыць аб зацікаўленасці ў якасці падрыхтоўкі сваіх выпускнікоў.

Дарэчы, нельга назваць дастатковымі сродкі, якія адпускаліся на ўтрыманне курсаў. Прыкладныя расходы на ўтрыманне педагагічных курсаў складалі 14 480 руб. З гэтай сумы 600 руб. ішло на аплату працы дырэктару інстытута, які адначасова з'яўляўся загадчыкам педагагічных курсаў, 6000 на паўрочную плату выкладчыкам курсаў па 125 руб. за гадавую гадзіну (усяго 48), 780 руб. за кіраўніцтва педагагічнай практыкай, 200 руб. выдзялялася на папаўненне фондаў бібліятэкі, 200 руб. – на канцэлярскія расходы, 5400 руб. – на выдачу дапамогі бедным слухачкам і інш. [6].

У 1917 г. на ўтрыманне адкрытых пры Віцебскім і Мінскім настаўніцкіх інстытутах педагагічных курсаў быдо дадаткова выдзелена ў веданне дырэктараў у студзені 1206 руб., у лютым і сакавіку – па 2412 руб. Гэтыя выдаткі тлумачыліся рэзкім павышэннем «дарагавізны жыцця» як для выкладчыкаў, так і для выхаванцаў. Частка грошай ішла на дапамогу слухачам, якія па паходжанні былі выхадцамі з ніжэйшых і таму найбольш бедных слаёў грамадства.

Д. Сцяпура, дырэктар Мінскага настаўніцкага інстытута, у справаздачы заўважаў, што вучэбная справа на курсах пастаўлена добра. Выкладчыкі інстытута (М. Гамолка, А. М. Нікольскі, В. І. Ігнатоўскі, К. Н. Кудзін і інш.) аднесліся да сваіх новых абавязкаў выкладання на курсах з поўнай сур'ёзнасцю.

Неабходныя для тэарэтычных і практычных заняткаў вучэбныя дапаможнікі інстытут часткова меў свае (хімічны кабінет, мадэлі, прыборы, карціны і карты), часткова карыстаўся неабходнымі дапаможнікамі і абсталяваннем навучальных устаноў г. Яраслаўля (настаўніцкага інстытута, бібліятэкі мужчынскай гімназіі).

У цэлым узровень ведаў слухачак з кожным годам змяняўся ў лепшы бок. «Дастаткова добрымі поспехамі» адзначалі выхаванак 1-х курсаў, што ў многім тлумачылася нядрэннай базавай падрыхтоўкай перад залічэннем на курсы, існуючай сістэмай экзаменаў і паступленнем на вучобу на аснове конкурсу. На педагагічных саветах называліся прозвішчы тых, хто меў нездавальняючыя адзнакі, за пропускі заняткаў маглі выносіцца папярэджанні і вымовы, а настаўнікам-прадметнікам ставілася ў абавязак звярнуць на непаспяваючых асаблівую ўвагу. Гэта праблема ў абявязковым парадку разглядалася на наступным пасяджэнні педагагічнага савета інстытута. У плане выхаваўчай працы ладзіліся цікавыя мерапрыемствы. Так, да дня першай гадавіны адкрыцця курсаў быў праведзены літаратурна-вакальны ранішнік, у якім прынялі ўдзел прадстаўнікі грамадскасці, выкладчыкі і вучаніцы.

У 1916 г. была арганізавана адукацыйная экскурсія ў Маскву, «каб мець магчымасць пакланіцца старажытнарускім святыням і азнаёміцца з важнейшымі гістарычнымі помнікамі рускай даўніны». Разам з тым, на пасяджэнні педагагічнага савета было выказана пажаданне «аб вызваленні ад усялякіх выдаткаў на экскурсію, бо амаль усе слухачкі курсаў па сваім сацыяльным паходжанні належаць да найбольш беднай часткі насельніцтва г. Мінска і яго губерні». У маі 1916 г. была арганізавана экскурсія для 25 выхаванцаў і 8 выкладчыкаў у г. Кастраму і Растоў. Кіраўніцтва чыгункі, згодна спецыяльнай пастанове, прадаставіла «льготныя тарыфы на праезд вучняў, якія адпраўляюцца на агульнаадукацыйныя экскурсіі» [7].

**Заключэнне.** Як паказаў час, педагагічныя курсы адыгралі пэўную станоўчую ролю ў падрыхтоўцы настаўніцкіх кадраў, нягледзячы на тое, што іх кваліфікацыя некалькі адставала ад кваліфікацыі выпускнікоў настаўніцкіх інстытутаў. Гэта тлумачыцца галоўным чынам кароткім тэрмінам навучання і недахопам матэрыяльных сродкаў на добрую арганізацыю заняткаў. Дырэктар Мінскага настаўніцкага інстытута ў гэтай сувязі адзначаў, што «нягледзячы на добрасумленныя адносіны да сваіх абавязкаў як выкладчыкаў, так і слухачоў курсаў, усе яны разумеюць, што аднаго года заняткаў для падрыхтоўкі да выкладання ў вышэйшых пачатковых вучылішчах недастаткова, курсы павінны быць двухгадовымі» [8]. Але ў дадзенай сітуацыі пры вострым дыфіцыце спецыяльна падрыхтаваных настаўнікаў педагагічныя курсы з'яўляліся ўстановай не толькі пажаданай, але і неабходнай.

## Літаратура

1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 458. Дырэкцыя народных вучылішчаў Мінскай губерні. – Воп. 1. – Спр. 490. – Л. 532.

2. НГАБ. – Ф. 2254. Дырэкцыя народных вучылішчаў Магілёўскай губерні. – Воп. 1. – Спр. 266. – Л. 13.

3. Лухверчык, В. М. Сярэднія педагагічныя навучальныя ўстановы дарэвалюцыйнай Беларусі / В. М. Лухверчык // Народная асвета. – 2002. – № 1. – С. 69–71.

4. НГАБ. – Ф. 479. – Оп. 1. – Д. 1. Книга протоколов заседаний педагогического совета Минских женских 2-годичных педагогических курсов. – Л. 3.

5. НГАБ. – Ф. 478. – Оп. 1. – Д. 56. Дело об открытии временных одногодичных педагогических курсов при учительских институтах. – Л. 2.

6. НГАБ. – Ф. 478. – Оп. 1. – Д. 56. Дело об открытии временных одногодичных педагогических курсов при учительских институтах. – Л. 10.

7. НГАБ. – Ф. 478. – Оп. 1. – Д. 59. Дело о совершении экскурсии воспитанниками института. – Л. 1–2.

8. НГАБ. – Ф. 478. – Оп. 1. – Д. 56. Дело об открытии временных одногодичных педагогических курсов при учительских институтах. – Л. 31.

*Пастуліла 30.03.2011*